Сяргей Панізьнік



...любоўю не клянуцца, –
жывуць любоўю...

# Гарыць жырандоль...

### На шляху з Грэкаў у Варагі

Зноў пракукарэкала
раніца карчагаю.
    Праплываю з грэкаў я
    ў логава варагава.
Чарнамор’е зыбкае
ў ростра[1] біла розгамі.
    Ох, было мне зыбкаю
    і стырно дняпроўскае!
Шлях ідзе зігзагамі,
над вірамі дыбіцца.
    Дайнамі і сагамі
    дно маё тубыліцца.

[1] ростра – насы караблёў;

Шлях узносіў выхрыстаў
і ватагу п’яную…
    Як хацеў я выпрастаць
    вось мерыдыянную, –
каб ня зналі полаўцы,
як душыўся крагамі[2]
    з грэкамі – у проламцы,
    у агні – з варагамі…

## ПРЫчАСЬЦЕ

Казённы хлеб надзённы –
    не для прычасьця…
Любові верацёны
    прыму на шчасьце:
і два жыцьці саткуцца
    паміж сабою.
Любоўю не клянуцца, –
    жывуць любоўю.
Маёй планіды крона,
    пабудзь зялёнай!
Каханьне – абарона
    душы натхнёнай.
Любоў перазімуе
    усе напасьці…
Не Беларусь сумуе, –
    маё прычасьце.

## ЗРУХ

А ранічкаю сьвежай
мне сонейка гарэла.
    (Грэла...)
Удзень гняла работа
і падганялі стрэлкі.
    (Стрэмкі...)
На вечар – анічога:
ні сілы, ні ахвоты.
    (Годы…)
Агорклі ўсе турботы
і сьпешка мне абрыдла.
    (Крыўдна...)

«Цярпі!» – мяне вучылі,–
«Цягай ваду са студні!»
(Трутні…)
Усохлая Радзіма.
Прасіцелася донца.
(Стронцый…)
Што робяць з Беларусяй!
І я глумлюся, дзербнік…
(Дзе мы?)
Мы пасярод пустыні.
Пайду, пясок насею
Майсею.

## ЖЫРАНДОЛЬ

Харомная зала.
Паднебная столь.
Два словы сказала…
Гарыць жырандоль.
Заціснула ў церні
сузор'яў эскіз.
Партрэтныя цені
спускаюцца ўніз.

На мармуры сходняў –
з пагрозамі бас…
Харалы сягоньня
былі не для нас.
Харомная зала.
Паднебная столь.
Прайшла… І ня стала.
Гарыць жырандоль.

З тэатра спатканьняў
вяртаешся ў дом.
А пульсам каханьня
гучыць метраном.
Харомная зала.
Паднебная столь.
Ня сьціхла «Асанна!»
Гарыць жырандоль.

### Верхнядзьвінскае прысьвячэньне

*Бібліятэкарцы*
*Валянціне Іосіфаўне Крук*

Дом бабкі Параскі…
Ключы – у трысьці.
Дзьвіна – наўзамен засмучэньню:
ня кожнаму сёньня па сіле плысьці
  уверх па цячэньні.

У Дрысу, Сар'янку
цячэ Палата…
Вы служыце іх асьвячэньню.
Планіду ж вядзе не вада, – правата:
  «Уверх па цячэньні!»

Дзьвіной падпярэзаны
праца і лёс.
Зноў бераг заве на вячэрню…
Хачу, каб ганок жыцьцядайны Вас нёс
  уверх па цячэньні.

Наш Полацак стольны чакае даўно
князёўны руплівую сьветласьць.
Уверх па цячэньні! Трымайце стырно
і кнігі Скарынавай
  ветразь!

### ПРЫТУЛАК БЕЖАНКІ

*«1919 год. Трапілі мы ў Дрысу. Помню лес, абрыў Дзьвіны… Пажар у Дрысе. Пабаяліся застацца ў гарадку. У вёсачцы Жоўніна нанялі хату. Там і перазімавалі. Зіма ў Жоўніне мне запомнілася на ўсё жыцьцё. Там я першы раз спаткалася з жывой беларускай мовай. Так яна мне ўпадабалася…»*

Натальля Арсеньнева.

Згукамі напоўнена
восеньскае Жоўніна…
  Дзе Арсеньнева жыла,
  памяць – кветкай зацьвіла.
Сэрцайка намоўлена

жаўрукамі Жоўніна.
За Дзьвіну скрануўся воз:
Вільняй адгукнуўся лёс.

Жмурыстага Жоўніна
слова адухоўлена, –
і «Магутны Божа» змог
веснавесьціць наш парог.

Небам сінім злоўлена
жураўліха Жоўніна…
Пад крылом яе – наўсьцяж –
наша Прышласьць, Бераг наш.

**Гульня ў жмуркі**

Не па сіле весьці рэй –
і прыходзіў Рурык.
За тубыльцаў быў мудрэй,
сьмелы па натуры:
непавязаны знутры,
неспавіты звонку…

Працавалі пры двары
толькі на скарбонку:
суцішаецца раздрай –
самаедства вяне…

Просяць: «Рурык! Дай нам рай.
Мы ж усе – славяне!»

Колькі ў жмуркі нам гуляць?
Засьціла свабода.
…Ці ж нам Рурыка ўслаўляць?

Помніць полацкая раць:
род – ад Рагвалода.

**Паўдзённы трыпціх**

**1.**

Мой кожны аловак ня зломак:
чорны рысуе рысы –
Крыма абрысы,

зялёны – вечназялёныя кіпарысы.
Клічу чырвоны аловак на помач
словы накрэсьліць, перадусім –

Багдановіч
Максім

Мой сіні малюнак – мора,
белы – памяць…
Весьняя Ялта
высахлыя касачы паліць.

**2.**

Не прыступкі, а глыжы…
Там, дзе душы, ні душы.
З мармуру галовы.
Разьвітацца з летам
еду за паўсьвета.
Між цьвінтарнае цішы
помнік, ці аловак
нашага паэта?
Крэйда не для крэда:
па краёчку Ялты
ён рысуе парты,
дзетак і Буквар,
свой самотны твар…

**3.**

Вечны аловак –
ня зломак:
малюе ўсё лепей.
Ня ў склепе!
Акрэсьліў:
шлях на Поўнач
ад Крыма
блізкі зусім.
Вырай у небе.
Чытаю на крылах:

Багдановіч
Адамаў Максім